# СА СВЯТАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (481) | Субота, 7 лістапада 1981 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




## ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХАМ

Над прасторамі нашай магутнай сацыялістычнай Радзімы лунаюць чырвоныя сцягі Кастрычніка. Самым пераканаўчым чынам гісторыя Краіны Саветаў сведчыць аб тым, што Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя з'явілася самым значным паваротам у жыцці не толькі нашага народа, але і ў лёсах усяго чалавецтва. «Знішчэнне капіталізму і яго слядоў, — указваў У. І. Ленін, — увядзенне асноў камуністычнага парадку складае змест пачаўшайся цяпер новай эпохі ў сусветнай гісторыі». Без Вялікага Кастрычніка зусім іншым было б сёння аблічча нашай планеты, зусім іншымі былі б і лёсы народаў свету.

Сёлетні Кастрычнік мы сустракаем пад знакам ажыццяўлення гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС. З'езд вызначыў дакладную і ясную праграму рэвалюцыйна-пераўтваральнай дзейнасці партыі і народа на 80-я гады, указаў шлях да новых рубяжоў эканамічнага, сацыяльнага і культурнага прагрэсу. Рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя з уздымам успрынялі выпрацаваныя з'ездам чарговыя задачы партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі, адзінадушна адобрылі яе ленінскі курс.

Па склаўшайся традыцыі ў гэтыя дні працоўныя рапартуюць аб сваіх дасягненнях. Наш шматтысячны калектыў узяў добры старт у першым годзе адзінаццатай пяцігодкі. Па выніках навукова-даследчай работы апублікавана 11 манаграфій, кніг, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Вынікі

**М. І. СТАРАВОЙТАЎ,**
**сакратар парткома**

зробленых распрацовак укаранёны ў вытворчасць з агульным эканамічным эфектам амаль у 2 мільёны рублёў. У 1981 годзе абаронена доктарская дысертацыя і 8 кандыдацкіх. Двум загадчыкам кафедр — У. Д. Арэшчанку і У. М. Калмыкову — прысвоена вучонае званне прафесара.

Рост прафесійнага і навуковага майстэрства нашых выкладчыкаў садзейнічае пастаяннаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу. Колькасць студэнтаў, якія вучацца толькі на «выдатна» і «добра», склала за 1980—1981 навучальны год 34,6 працэнта, што на 3,9 працэнта вышэй, чым у папярэднім годзе. У летнім працоўным семестры 1981 года студэнцкія будаўнічыя атрады асвоілі прыкладна 900 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, аказалі дапамогу 329 сем'ям ветэранаў вайны і працы.

Камсамольская арганізацыя універсітэта мае вялікі вопыт і добрыя традыцыі ваенна-патрыятычнага выхавання. Партыйны камітэт, камітэт камсамола, прафком, камітэт ДТСААФ праводзяць вялікую работу па арганізацыі Зорных паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Камсамольцы актыўна ўдзельнічаюць і ва ўсіх іншых формах гэтай работы. Па выніках рэспубліканскага конкурсу па пастаноўцы ваенна-патрыятычнай работы за 1980-1981 навучальны год наш універсітэт прызнаны лепшым сярод ВНУ рэспублікі. Камсамольская арганізацыя ГДУ ўзнагароджана Ганаровай граматай і прэміявана рэспубліканскім камітэтам ДТСААФ.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за тры кварталы першага года адзінаццатай пяцігодкі Цэнтральны раён удастоены пераходнага Чырвонага Сцяга гарадскога камітэта КПБ і выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў. Працоўныя раёна адкрыюць святочную дэманстрацыю гамяльчан. У гэтым дасягненні ёсць часцінка працы і універсітэцкага калектыву. Нашы выкладчыкі актыўна ўдзельнічалі ў ідэйна-палітычнай і выхаваўчай рабоце працоўных калектываў. Унесены пасільны ўклад і ў аказанне дапамогі сельскай гаспадарцы. У падшэфным саўгасе «Рэчкі» Веткаўскага раёна ў летне-асенні перыяд на сельгасработах сёлета працавала 645 выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў. Многае зроблена на сельскагаспадарчай вытворчасці і студэнцкімі атрадамі.

Рыхтуючыся да знамянальнага свята, універсітэцкі калектыў працаваў плённа і творча, каб сустрэць яго дастойна і новымі дасягненнямі завяршыць першы год адзінаццатай пяцігодкі.

Ад імя партыйнага камітэта, рэктарата, грамадскіх арганізацый горача віншую вас, дарагія таварышы, з 64-й гадавінай Вялікага Кастрычніка, жадаю здароўя, асабістага шчасця, новых поспехаў у навукова-педагагічнай і гаспадарчай дзейнасці, вучобе і грамадскай рабоце на карысць нашай сацыялістычнай Айчыны.

## ПРЫСВЕЧАНЫ СВЯТУ

Учора ў актавай зале адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 64-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Ва ўрачыстай абстаноўцы быў зачытаны загад па універсітэту, у якім рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць павіншаваў універсітэцкі калектыў са знамянальным святам, а лепшым выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам за актыўную навукова-педагагічную, гаспадарчую і грамадскую работу, паспяховую вучобу аб'явіў падзяку.

З дакладам аб 64-й гадавіне Вялікага Кастрычніка выступіў старшыня мясцкома кандыдат гістарычных навук М. Н. Мурашка.

Для ўдзельнікаў святочнага вечара сіламі самадзейных артыстаў універсітэта быў дадзены канцэрт.

(Наш кар.).

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет кафедр грамадскіх навук, кафедра палітэканоміі горача віншуюць асістэнтаў гэтай кафедры КАНАШЭВІЧА Анатоля Ісідаравіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук і ГЕРАСІМЧЫКА Мікалая Вікенцьевіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.**

*Роздум маладога сучасніка*

## У СЭРЦЫ НАШЫМ

Вось і яшчэ аднага гадавіна вялікай рэвалюцыі, якая пераўтварыла свет, цяпер ужо 64-я! Сёння, гледзячы на равеснікаў Кастрычніка, мы заўважаем, як яны пасівелі. А рэвалюцыя наша застаецца і заўсёды будзе маладой, таму што няма нічога вышэйшага і больш дасканалага за тое, да чаго яна заклікае і вядзе чалавецтва: свабоды і сацыяльнай роўнасці, міру.

За плячыма нашай краіны слаўныя 64 гады, і таму нялёгка са шчыльнай тканіны гадоў выбраць якую-небудзь асаблівую падзею і катэгарычна назваць яе галоўнай. Але адно мы ведаем цвёрда: усё вялікае і малое, што было і ёсць у нас, як і само жыццё, непарыўна звязана з Кастрычнікам.

Магчыма, гэта напоўнены гераікай стварэння час будаўніцтва Магніткі, Днепрагэса, Камсамольска-на-Амуры. Магчыма, гэта мінута, калі святочны салют абвясціў аб Перамозе, аддаючы даніну павагі тысячам тысяч тых, хто знішчыў фашысцкую навалу. Або аддаць перавагу кастрычніку 1954 года, калі ў засекі Радзімы лёг першы вялікі хлеб казахстанскай цаліны, якога не ведаў стэп за ўсю гісторыю свайго існавання. Не забыць тую восень, калі, як піша ў сваёй кнізе «Цаліна» таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў, «...прыйшоў доўгачаканы і ўсё-такі нечаканы вялікі хлеб цаліны».

Пад знакам Кастрычніка праходзіць усё наша жыццё. Кастрычнік стаў сутнасцю, асновай нашага лёсу. Таму для нас і многіх іншых людзей на зямлі Кастрычніцкая гадавіна — свята.

Але па гэтай жа прычыне для некаторых, — а ёсць яшчэ і такія, наша свята, як напамінак аб страчаных надзеях аднавіць былое. Немагчыма ўявіць сабе, але гэта таксама факт, што для часткі людзей на нашай планеце праўда аб нашай краіне, аб Кастрычніцкай рэвалюцыі знаходзіцца пад забаронай афіцыйных улад некаторых краін. Гэта тыя, каму ненавісныя свабода і сацыяльная справядлівасць, роўнасць, мір. Для іх праўда аб нашай краіне — непрыймальная.

Кастрычніцкая рэвалюцыя абвясціла аб наступленні новай эры ў гісторыі чалавецтва, светлай будучыні ў жыцці ўсіх народаў. Яна не была выпадковасцю. Яе парадзілі аб'ектыўныя законы гістарычнага развіцця. І гэта самая жорсткая праўда для старога свету: нічым не спыніць наспеўшыя змены. Доказы гэтага адбываюцца штодзённа: перамога в'етнамскага народа, крах шахскага рэжыму ў Іране, рэвалюцыя ў Нікарагуа. Магчыма, канешне, з дапамогай фашызму, масавых забойстваў «спыніць імгненне» ў Чылі, Сальвадоры ці ў Намібіі. Але, колькі б не забівалі, гісторыю не спыніць.

Зразумела, у кожнай краіны свая гісторыя, у кожнага народа — свой лёс. Але ва ўсіх краін і ва ўсіх народаў ёсць свая светлая будучыня, сваё шчасце. І яны, рана ці позна, прыдуць да яго. І вялікі натхніцель у гэтым — наша Кастрычніцкая рэвалюцыя.

Учора, сёння і заўтра ў золаце асенняга лісця ўспыхваюць сцягі і транспаранты галоўнага свята нашай краіны — гадавіны Вялікага Кастрычніка. У чырвані сцягоў мы бачым зарніцы таго высокага ачышчальнага полымя, якое асвяціла наш шлях дзесяткі гадоў назад.

**Ларыса ЦІМОХАВА,**
**студэнтка трэцяга курса эканамічнага факультэта.**

64

